МІЖДЗЯРЖАЎНАЯ АДУКАЦЫЙНАЯ ЎСТАНОВА
ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ»

Кафедра «Гуманітарныя дысцыпліны»

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)

***Метадычныя рэкамендацыі да практычных заняткаў для студэнтаў усіх спецыяльнасцяў дзённай і завочнай форм навучання***

**Б**

Магілёў 2022

УДК 811.161.3
ББК 81.2 Бел
Б 43

Рэкамендавана да выдання
вучэбна-метадычным аддзелам
Беларуска-Расійскага ўніверсітэта

Адобрана кафедрай «Гуманитарныя дысцыплины» «10» лістапада 2022 г., пратакол № 4

Складальнік ст. выкладчык А. В. Шарапава

Рэцэнзент канд. філал. навук, дац. В. М. Шаршнёва

Метадычныя рэкамендацыі да практычных заняткаў па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» уключаюць у сябе практычныя заданні рознага тыпу для праверкі і замацавання ведаў па розных раздзелах вучэбнай дысцыпліны, заданні для кантралюемай самастойнай работы студэнтаў, пералік пытанняў для заліку, спіс літаратуры для вывучэння.

Прызначаецца студэнтам I курса тэхнічных спецыяльнасцяў дзённай і завочнай форм навучання.

Вучэбна-метадычнае выданне

БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)

| | |
|---|---|
| Адказны за выпуск | Н. М. Рытава |
| Карэктар | Т. А. Рыжыкава |
| Камп'ютарная вёрстка | М. М. Дударава |

Падпісана ў друк 23.12.2022 . Фармат 60×84/16. Папера афсетная. Гарнітура Таймс.
Друк трафарэтны. Ум. друк. арк. 2,33. Ум.-выд. арк. 2,44. Тыраж 56 экз. Заказ № 1245.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Міждзяржаўная адукацыйная ўстанова вышэйшай адукацыі
«Беларуска-Расійскі ўніверсітэт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вырабляльніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/156 ад 07.03.2019.
Пр-т Міру, 43, 212022, г. Магілёў.

© Беларуска-Расійскі
ўніверсітэт, 2022

# Змест

1 Беларуская мова як частка нацыянальнай культуры……………… 4
2 Сістэмная арганізацыя беларускай мовы………………………….. 6
3 Беларуская мова сярод іншых моў………………………………… 8
4 Гісторыя беларускай літаратурнай мовы………………………….. 10
5 Моўная сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь………………………….. 12
6 Нормы беларускай літаратурнай мовы…………………………….. 13
7 Лексічная сістэма беларускай мовы……………………………….. 21
8 Тэрміналогія як вядучы складнік прафесійнага маўлення……….. 24
9 Гісторыя і сучаснасць беларускай тэрміналогіі і тэрмінаграфіі….. 27
10 Функцыянальныя стылі беларускай літаратурнай мовы………….. 29
11 Навуковы стыль……………………………………………………… 30
12 Афіцыйна-справавы стыль…………………………………………... 32
13 Культура прафесійнага маўлення…………………………………... 33
14 Тэмы для рэфератаў з прэзентацыямі………………………………. 34
15 Заданні прадуктыўна-творчага ўзроўню……………………………. 34
16 Тэксты для перакладу і заданні, арыентаваныя на фарміраванне прафесійных кампетэнцый………………………………………………. 35
17 Пытанні для заліку…………………………………………………... 38
Спіс літаратуры………………………………………………………... 39

# 1 Беларуская мова як частка нацыянальнай культуры

***Заданне 1.1***

Прачытайце тэкст[1]. Назавіце:

а) крытэрыі, якія прямяняюцца пры вызначэнні паняцця «родная мова»;
б) тры найважнейшыя функцыі роднай мовы;
в) аўтарскае вызначэнне паняцця «родная мова».

Дайце абгрунтаваны адказ на пытанні:

а) што такое «родная мова» для вас;
б) якую мову вы лічыце роднай і чаму.

«Родная мова» – выраз не строга тэрміналагічны. Ён, хутчэй, адносіцца да сферы нацыянальнай псіхалогіі і этнічнага самаўсведамлення народа, чым да лінгвістыкі. Але эвалюцыя міжнацыянальных адносін у XX ст. паставіла гэта паняцце ў цэнтр многіх тэарэтычных і практычных задач, звязаных з праблемамі суверэнітэту народаў, нацый і этнасаў, іх нацыянальна-культурнага развіцця, выбару дзяржаўнай мовы і моў міжнацыянальных зносін, вызначэння статусу і функцый моў народнасцей, што не маюць дзяржаўнай аўтаноміі, і г. д. У выніку такі ясны выраз, як «родная мова», канцэптуальна ўскладніўся і, пакінуўшы межы этналогіі і псіхалінгвістыкі, набыў паліталагічнае гучанне і міждысцыплінарны статус.

Вынікам гэтага сталася тое, што «родная мова» пачала акрэсліваццa па-рознаму ў залежнасці ад зыходных метадалагічных пазіцый, агульных і прыватных тэарэтычных канцэпцый і нават палітычных прыхільнасцей. Існуе нямала спроб яго азначэння і характарыстык. Вось некаторыя з іх. Родная мова – тая, што першай засвоена ў дзяцінстве ў сямейным асяроддзі і што застаецца зразумелай усё жыццё. Родная – мова, якой чалавек валодае максімальна глыбока і поўна, на якой яму лягчэй, хутчэй і прасцей мысліць, больш зручна і прывычна, чым на якой-небудзь іншай, выказваць свае думкі і пачуцці. Родная мова спасцігаецца чалавекам адначасова з развіццём здольнасці мысліць. Гэта, хутчэй, прысваенне мовы, а не яе асваенне, вывучэнне.

Самая істотная ўласцівасць роднай мовы – даваць магчымасць асобе ідэнтыфікаваць сябе і ў адпаведнасці з гэтым атрымаць усе характарыстыкі гэтага стану: лёгкасць, хуткасць, прастату, зручнасць, звычайнасць карыстання роднай мовай як формай сацыяльнага быцця. Роднай называюць і мову нацыі, засвоеную з дзяцінства. Гэта мова бацькоў, мова свайго народа. Пры двухмоўі і шматмоўі – гэта мова штодзённых зносін. Існуе думка, што пры дасканалым веданні дзвюх моў і аднолькава лёгкім валоданні імі ў любых абставінах можна гаварыць пра дзве родныя мовы.

Варта звярнуць увагу, наколькі розныя прыкметы і ўласцівасці пакладзены ў аснову раскрыцця гэтага паняцця – ад мовы, успрынятай у дзяцінстве, да сукупнасці ўсіх відаў і форм знакавых сістэм, якімі карыстаецца чалавек ва ўмовах сучаснай цывілізацыі. Паказальна і тое, што ўсе гэтыя прыкметы

---

[1] Тут і далей тэксты для перакладу падабраныя з выкарыстаннем рэсурсаў інтэрнэта.

навукова і сацыяльна значымыя пры пошуку адказу на пытанне, што такое родная мова.

Аднак з усіх рысаў, асаблівасцей, прыкмет, функцый роднай мовы, што адзначаюць розныя даследчыкі, трэба вылучыць дзеля іх асаблівай значнасці тры функцыі: мыслення, выражэння думкі і самаідэнтыфікацыі. Усё астатняе ў мове, якую чалавек лічыць сваёй роднай (час і спосаб валодання ёю, ступень яе разумення, штодзённасць зносін, пазнавальныя магчымасці, назапашванне ведаў у памяці, эмацыянальнасць, здольнасць служыць сродкам сацыяльнай барацьбы і г. д.), падпарадкавана тром гэтым яе функцыянальным прыкметам.

Зыходзячы з гэтых меркаванняў, паняццю «родная мова» можна даць наступнае азначэнне: роднай называецца мова, на якой чалавек мысліць без дастатковага самакантролю, з дапамогай якой лёгка і натуральна выражае свае думкі ў вуснай і пісьмовай слоўнай форме, якая служыць падмуркам яго этнічнага самаўсведамлення, яго этнічнай і нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. (*А. Я. Міхневіч. Беларуская мова* : *Энцыклапедыя*).

***Заданне 1.2***

Карыстаючыся энцыклапедычным слоўнікам «Міфалогія беларусаў» (энцыклапедычны слоўнік / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – 607 с.), падрыхтуйце паведамленне пра кветкі, дрэвы, птушак і іншае, што стала сімвалічным для беларусаў.

***Заданне 1.3***

Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку. Пералічыце характэрныя асаблівасці беларускага чалавека.

Ці думалі вы пра беларусаў не як пра сваіх бацькоў, братоў і сёстраў, сяброў або аднавяскоўцаў, а як увогуле пра людзей з асобным характарам? Ці задумваліся, які ён, беларус? Што гэта за народ? Давайце паразважаем разам.

Адказаць на гэта пытанне цяжка. Як і паўсюль, ёсць сярод беларусаў розныя людзі. Аднак усё ж можна назваць некаторыя досыць тыповыя рысы, уласцівыя народнаму беларускаму характару.

Рысы аблічча беларуса мяккія, склад здаецца крыху далікатным, хоць для беларуса характэрна працавітасць, вынослівасць, цягавітасць. Там, дзе другі можа апусціць рукі, беларус будзе цягнуць. Іначай, у старыя часы, чалавек проста не выжыў бы сярод гэтых дрымучых лясоў і неабсяжных балот. І гарт той застаўся ў яго характары на вякі.

Манера паводзін вызначаецца павольнасцю, стрыманасцю. Праўда, стрыманасць беларуса да пары. Пяройдзеш мяжу – і беларус пакажа, як паказаў у мінулай вайне, на што ён варты, калі вораг падніме руку на яго жыццё.

Уласціва нашым людзям знаходлівасць. Беларус – вялікі аматар пажартаваць, ён не можа абысціся без гумару. Беларусы адрозніваюцца шчодрасцю, заўсёднай гатоўнасцю прыйсці на дапамогу ў бядзе. Яны звычайна мяккія, даверлівыя, пазбаўлены помслівасці. Галоўнае ў нашым характары –

гасціннасць да добрых людзей. Па агульным назіранні, беларусам уласціва павага да іншых народаў і памяркоўнасць да таго, хто думае іначай. (*Паводле У. Караткевіча*).

***Заданне 1.4***

Прачытайце выказванні беларускіх пісьменікаў пра мову. Узнавіце, каму належаць гэтыя словы.

1 Народ пранясе цябе, родная мова, // Святлом незгасальным у сэрцы сваім.

2 Мова – гэта вялікі народны скарб. Яе нельга не паважаць, як нельга не паважаць родны народ.

3 Не саромся, беларус, гаманіць па-свойму – на роднай мове бацькоў і дзядоў сваіх.

4 Трэба любіць, ведаць і шанаваць мову свайго народа і ўмець дасканала валодаць ёю.

5 Дала мне маці гэту мову, // Каб не нямым пайшоў у свет, // Дала мне маці гэту мову, // Як спадчыну і запавет.

6 Ты, мой брат, каго зваць Беларусам, // Роднай мовы сваёй не цурайся; // Як не зрокся яе пад прымусам, // Так і вольны цяпер не зракайся.

## 2 Сістэмная арганізацыя беларускай мовы

***Заданне 2.1***

Вызначце адрозненне двух кампанентаў нацыянальнай мовы, запоўніце пустыя ячэйкі табліцы 1.

Табліца 1 – Літаратурная і дыялектная мовы

| Літаратурная мова | Дыялектная мова |
|---|---|
| | Вузкалакальная, характэрная для пэўных мясцовасцей |
| Валодае нормамі | |
| | Стыляў не мае |
| Існуе ў двух варыянтах – вусным і пісьмовым | |
| | Некадыфікаваная |

***Заданне 2.2***

Устаўце на месцах пропускаў неабходныя словы.

1 … норма – адказвае за правільнае вымаўленне гукаў.

2 … норма – адказвае за правільную пастаноўку націску.

3 … норма – адказвае за правільную пабудову слоў па ўласцівых для мовы словаўтваральных мадэлях.

4 … норма – адказвае за правільнае словаўжыванне ў маўленні.

5 … норма – адказвае за правільную пабудову словазлучэнняў і сказаў.

6 … норма – адказвае за правільнае ўжыванне фразеалагізмаў у маўленні.

7 … норма – адказвае за правільнае ўжыванне значэнняў слоў.

8 … норма – адказвае за правільнае ўжыванне стыляў.

9 … норма – адказвае за правільнае напісанне слоў.

10 … норма – адказвае за правільную пастаноўку знакаў прыпынку.

***Заданне 2.3***

Суаднясіце паняцці і іх азначэнні. Свае адказы запішыце.

1 Гукавая форма мовы, якой карыстаюцца людзі ў непасрэдных зносінах паміж сабой.

2 Афіцыйная мова, на якой працуюць дзяржаўныя і адміністрацыйна-гаспадарчыя органы, грамадскія арганізацыі, установы навукі, культуры, службы быту, гандлю і іншыя і на якой вядзецца навучанне і выхаванне ў сістэме адукацыі.

3 Форма нацыянальнай мовы, якая характэрна пэўным мясцовасцям (вузкалакальная), не валодае нормамі і стылямі і існуе толькі ў адным варыянце – вусным.

4 Апрацаваная, упарадкаваная і нармалізаваная форма агульнанароднай мовы, прызначаная для абслугоўвання разнастайных сфер грамадскай дзейнасці чалавека.

5 Сістэма матэрыяльных адзінак (тыповых гукаў, марфем, слоў, словазлучэнняў, сказаў), а таксама сістэма правіл іх функцыянавання (граматыка).

6 Гістарычна складзеная разнавіднасць літаратурнай мовы, якая абслугоўвае пэўную сферу дзейнасці: навуку, адміністрацыйна-справавыя адносіны, грамадска-палітычнную дзейнасць, бытавыя зносіны, мастацкую творчасць.

7 Сукупнасць правіл, прынятых у дадзены перыяд моўным калектывам і ўсвядомленых ім як правільнае і ўзорнае ўжыванне моўных сродкаў.

8 Графічная форма мовы, якая дазваляе кантактаваць апасродкавана з дапамогаю тэкстаў, сукупнасць якіх стварае нацыянальнае пісьменства.

*Словы для даведак*: дзяржаўная мова, моўны стыль, пісьмовая мова, вусная мова, норма, дыялектная мова, мова, літаратурная мова.

***Заданне 2.4***

Якія з прыведзеных азначэнняў, выказванняў суадносяцца са словам мова, якія са словам маўленне? Абгрунтуйце свой адказ.

1 … – мова ў дзеянні, мова ў працы.

2 … – сістэма сродкаў, якія забяспечваюць суразмоўніцтва.

3 … – працэс выкарыстання моўных адзінак для перадачы пэўнага зместу.

4 … – найважнейшы сродак зносін паміж людзьмі.

5 … – з’ява сацыяльная (грамадская), а … – з’ява індывідуальная.

6 … – істотная адзнака этнічнага калектыву – народа, нацыі.

7 … – заўсёды камусьці адрасавана, адбываецца ў пэўных абставінах.

8 … – сукупнасць лексічных, граматычных і іншых сродкаў выражэння думак.

9 … – вуснае і пісьмовае валоданне моваю.

10 … – абстрактная, а … – канкрэтнае.

11 … – сістэма, а … – рэалізацыя сістэмы.

***Заданне 2.5***

Прачытайце прыказкі. Пра якія функцыі мовы ідзе гаворка ў гэтых народных выслоўях?

1 Язык і да Кіева давядзе.

2 Добрае слова далёка чуваць.

3 Ласкавае слоўка, як сонейка грэе.

4 Хто болей знае, той болей пытае.

5 Які розум, такая і гаворка.

6 Якое пытанне, такі і адказ.

7 Гаворыць, як тры дні не еўшы.

8 Невядомая дарога на канцы языка.

## 3 Беларуская мова сярод іншых моў

***Заданне 3.1***

Параўнайце беларускі тэкст з перакладам яго на рускую, украінскую, балгарскую, польскую і сербскую мовы. Назавіце рысы, агульныя для ўсіх славянскіх моў. Знайдзіце рысы, характэрныя толькі для беларускай мовы. Паразважайце, якое месца займае беларуская мова сярод іншых славянскіх моў.

Без мовы не можа быць народа. Калі памірае мова, памірае народ, сыходзіць з гістарычнай сцэны. Добра ведаючы гэта, ад бязроднага нігілізму перасцерагаў Францішак Багушэвіч. «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмерлі!» – пісаў ён у прадмове да свае кнігі. (*Я. Скрыган*).

Без языка не может быть народа. Если умирает язык, умирает народ, сходит с исторической сцены. Хорошо зная это, от безродного нигилизма предостерегал Франтишек Богушевич. «Не оставляйте язык наш белорусский, чтобы не умерли!» – писал он в предисловии к своей книге. (*Я. Скриган*).

Без мови не може бути народу. Якщо вмирае мова, то вмирае народ, сходить з історичноі сцени. Добре це знаючи, від безродного нігілізму застерігав

Францішек Богушевич. «Не залишайте ж мови нашоі білоруськоі, щоб не вмерли!» – писав він у передмові до своеі книги. (*Я. Скриган*).

Без език не може би народ. Като умира езикът, умира народът, слиза от историческия сцена. Францишек Богушевич, знаейки добре мова, предпазваше от безродния нигилизъм. «Не изоставяйте нашият белоруски език, без него да умрем!» – пишеше той. (*Я. Скриган*).

Bez jezika ne može da bude narod. Kad umira jezik, pogine narod, otide sa istorijskog prizora. To dobro znajući od siročeg nigilizma upozoravao je František Bogušević. «Ne ostavite pak naš jezik beloruski, da ne biste poginuli!» – pisao je predgovoru kod svoje knjige. (*J. Skrigan*).

Bez języka nie może być narodu. Jeżeli język umiera, umiera naród, schodzi ze sceny historycznej. Dobrze to znając, od nihilizmu niskiego pochodzenia przestrzegał Franciszek Bohuszewicz. «Nie rzucajcie więc języka naszego, białoruskiego, żeby nie umarli!» – pisał w przedmowie do swojej książk. (*J. Skrygan*).

***Заданне 3.2***

Запоўніце табліцу 2, карыстаючыся звесткамі з адкрытых крыніц.

Табліца 2 – Індаеўрапейская моўная сям’я

| Індаеўрапейская моўная сям’я |
|---|
| Моўныя групы (прыкладная колькасць носьбітаў), моўныя падгрупы (калі ёсць) |
| 1 Славянская група (каля 300 млн чалавек).<br>а) усходнеславянская падгрупа – беларуская, руская, украінская мовы;<br>б) заходнеславянская падгрупа – …;<br>в) паўднёваславянская падгрупа – … |
| 2–16 |

***Заданне 3.3***

Перакладзіце словы і спалучэнні на беларускую мову. Параўнайце моўныя адзінкі беларускай і ўкраінскай моў.

Автозапчастини, аксесуари, роздриб, найменувань, переваги, еконамія, доставка, вартість, автоматично, місяць, придбати, моторна олива, максимальний захист двигуна, нові моделі, охоронні системи з необмежеваними можливостями, вартість передплати на ІІ-е півріччя 2021 року.

***Заданне 3.4***

Паглядзіце на карту распаўсюджанасці беларускіх прозвішчаў на малюнку 1. Назавіце славутых ураджэнцаў Беларусі, якія маюць прозвішчы кожнага тыпу.




Малюнак 1 – Карта распаўсюджанасці тыповых беларускіх прозвішчаў.

## 4 Гісторыя беларускай літаратурнай мовы

***Заданне 4.1***
Дапоўніце стужку часу.

1 Канец III – пачатак II тыс. да н.э. – …
2 VI – VII стст. н.э. – …
3 863 г. – …
4 968 г. – …
5 IX – XIII стст. – …
6 XIV – XVII стст. – …
7 1696 г. – …

*Для даведак:* перыяд распаўсюджвання пісьменнасці на старабеларускай літаратурнай мове, распад індаеўрапейскага маўленчага адзінства, пастанова Варшаўскага сейма аб забароне пісаць на старабеларускай мове, хрышчэнне Русі, распад агульнаславянскага моўнага адзінства, узнікненне і развіццё пісьменнасці на старажытнарускай мове, браты-асветнікі Кірыла і Мяфодзій стварылі першую славянскую пісьмовую мову.

***Заданне 4.2***
Спішыце тэкст, расстаўце знакі прыпынку, дапоўніце яго звесткамі аб жыцці і дзейнасці Францыска Скарыны.

Беларусы як і ўсе народы свету маюць сваіх выдатных сыноў. Фізічна адыходзячы ад нас у вечнасць яны духоўна застаюцца з намі. Прыкладам свайго жыцця сваім існаваннем яднаюць жывую повязь пакаленняў вечнасць і неўміручасць народа. Яны духоўныя павадыры і павадыры нацыі яе гонар і сумленне шчасце і радасць надзея і боль.

Пакуль будзе існаваць жыццё на зямлі датуль сэрца кожнага беларуса будзе саграваць вечнае сонейка імя якому Францыск Скарына.

У нашым уяўленні Ф. Скарына першы беларускі Апостал. Гэта маральны прапаведнік настаўнік жыцця прарок бескарыслівы падзвіжнік самаадданы служка народа які нясе яму веды святло ісціну.

***Заданне 4.3***

Растлумачце значэнне тэрмінаў.

Укладная грамата, даравальная грамата, статут, метрыка, летапіс, хроніка, трыбунал, манускрыт, кірыліца, скарапіс, паўустаў.

***Заданне 4.4***

Запішыце сказы, дапоўніўшы іх патрэбнай інфармацыяй.

1 У XIX ст. на змену паланізацыі мясцовага насельніцтва прыйшла ______________. Беларуская мова па-ранейшаму не дапускалася ў афіцыйны ўжытак.

2 У 1840 г. цар Мікалай I выдае загад аб увядзенні на Беларусі рускага заканадаўства і рускай мовы ва ўстановах. У гэтым жа годзе царскі ўрад забараняе назву _____________. Замест яе выкарыстоўваецца назва __________.

3 У 1870 г. з ’яўляецца тлумачальны «Словарь белорусского наречия», складзены______________________.

4 У другой палове XIX ст. ўзнікае і развіваецца арыгінальная беларуская літаратура. ______________________ выдаў паэтычныя зборнікі «Дудка беларуская», «Смык беларускі».

5 З 1906 г. пачынаецца гісторыя беларускай легальнай прэсы. У Вільні выдаецца спачатку газета _________________ (забаронена пасля выхаду шостага нумара), а затым__________________ (выходзіла да 1915 г.). Менавіта вакол гэтай газеты згуртаваліся беларускія пісьменнікі, якія рабілі першыя спробы нармалізацыі беларускай мовы.

6 Ствараюцца першыя ______________ беларускай мовы. Найбольшы аўтарытэт сярод гэтых прац мела выдадзеная ў 1918 г. граматыка _________. Аўтар _______________.

7 У __________ гады XX ст. беларуская мова набыла статус дзяржаўнай. Палітыка___________________, якая ажыццяўлялася ў Беларусі, дазволіла стварыць беларускамоўныя падручнікі па ўсіх прадметах, падрыхтаваць і выдаць шматлікія слоўнікі.

8 У _________ гады XX ст. працэс беларусізацыі быў спынены пасля ўсталявання таталітарнага рэжыму. Вялікая колькасць нацыянальных дзеячаў культуры была______________ . _____________ мова паступова замяняецца______________мовай у дзяржаўных установах.

9 У 40–80-я гг. XX ст. сферы выкарыстання беларускай мовы звужаюцца. На ёй ствараецца______________ літаратура, публіцыстыка, у пэўнай ступені яна выкарыстоўваецца ў ______________ навуцы, адукацыі.

10 Найбольш важнымі датамі ў развіцці беларускай мовы ў канцы XX – пачатку XXI ст. сталі:

– ____ – прыняты «Закон аб мовах», у адпаведнасці з якім беларускай мове нададзены статус дзяржаўнай;

– ___________ – праведзены рэферэндум, які ўзаконіў беларуска-рускае дзяржаўнае двухмоўе;

– _____________ – прыняты закон «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі», накіраваны на стабілізацыю нормаў сучаснай беларускай мовы.

## 5 Моўная сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь

***Заданне 5.1***

Перакладзіце назоўнікі на беларускую мову, падбярыце да іх прыметнікі.

Боль, бровь, бездорожье, будущее, гусь, доверие, доказательство, дробь, живопись, жизнеописание, занятие, кафель, кофе, летопись, медаль, мозоль, надпись, намерение, насыпь, начало, невежда, охапка, пар, перепись, подпись, полынь, посуда, продажа, пыль, роспись, россыпь, рукопись, салат, собака, спокойствие, средство, стадо, степь, творчество, тень, тополь, туфля, фальшь, фасоль, чудо, шинель, шоссе, щенок, щука, электричество, юность, яблоко.

***Заданне 5.2***

Запоўніце прапанаваную табліцу 3 па ўзоры.

Табліца 3 – Міжмоўныя амонімы

| Беларускае слова | Рускамоўны адпаведнік | Рускае слова | Беларускамоўны адпаведнік |
|---|---|---|---|
| *Нядзеля* | | *Неделя* | |
| Лук | | | Цыбуля |
| Бяседа | | Беседа | |
| Мова | | Язык (орган человека) | |
| Выгода | | Выгода | |
| | Ссора | | Зварка |
| Краска | | Краска | |
| | Утка | Качка | |
| Свет | | | Святло |
| Спор | | Спор | |

***Заданне 5.3***

Вызначце від інтэрферэнцыі ў наступных выразах.

Нарадзіўся ў васкрасенне, гасударства, хварэць ангінай, кантраліраваць, выйграць дзве залатыя медалі, прыгожая надпіс, сенцябар, гуляць на скрыпцы,

ажаніцца на Ірыне, міравая вайна, дзверi, старшая дачка, рэзультат, благадару цябе, смяяцца над сябрам.

***Заданне 5.4***

Знайдзіце памылкі ў сказах, выпраўце іх. Укажыце, якія ўзроўні мовы закранула беларуска-руская інтэрферэнцыя.

1 Чатыры вядра гарачай вады спатрэбілася, каб вымыць аўтамабіль.

2 У садах калгаса «Камінтэрн» пад Магілёвам кожнае лета голлі гнуцца ад яблыкаў, груш, сліў.

3 Два снегіры, як два чырвоных яблыкі, гайдаюцца на галінцы.

4 Яна ішла ў душы зычлівая яму, што паспеў у час, што засцярог ад граха.

5 Я выканаў Заданне дабрэй за ўсіх.

6 Вы можаце атрымаць спіс рэкамендуючай літаратуры.

7 Убачыўшы Віктара, Маню быццам хто падмяніў.

8 Прадпрыемства дасягнула вялікіх поспехаў у вобласці міжнароднага супрацоўніцтва.

9 Дзяўчына прачнулася, адчыніла вочы і вакно і пачала рабіць гімнастыку.

10 Дырэктар завода на планёрцы шмат гаварыў аб працоўнай дысцыпліне.

11 Ідзём мы неяк на паляванне, а тут ляціць дзікі гусь.

12 Толькі пяць вучняў з класа атрымалі выдатныя адзнакі па самастойнай рабоце.

13 Сучасныя вучні ніколі не пісалі чарніламі.

14 Андрэю далі гуляць галоўную ролю ў спектаклі «Радавыя» А. Дударава.

15 Ёсць у групе адзін жартаўнік, які вельмі любіць кпіць над сябрамі.

16 За ўсё, што вы расказалі, я вас так дзякую.

17 Вёска была яшчэ больш заснежаная і заінетая, з пацёкамі лёду ля студняў.

18 Пад’язджаючы да Мінска, у нас сапсаваўся аўтобус.

19 Максім хацеў падысці да дрэва найбольш бліжэй.

20 Старшыня калгаса хадзіў па палям, аглядаючы падрыхтоўку да сяўбы.

## 6 Нормы беларускай літаратурнай мовы

***Заданне 6.1***

Прачытайце словы, правільна вымаўляючы ўсе зычныя гукі. Выдзеленыя літары запішыце ў транскрыпцыі.

Агле**дзьц**е, а**дч**ыніць, а**св**ятляльны, бе**гч**ы, безад**к**ладна, була**чн**ая, бязвобла**чн**ы, ва**кз**ал, Вялі**кдз**ень, газе**тч**ык, грама**дс**кі, грама**дств**а, гру**зч**ык, да**жджж**лівы, да**сведч**ана**сць**, дасле**дч**ык, **дзв**ерцы, **дзвесц**е, дзя**дзьк**а, до**ждж**, е**дзьц**е, заво**дс**кі, збо**жж**а, **згіб**, **здзейсн**іць, ззя**нн**е, **зм**ена, **з’я**віцца, лё**тч**ык, лі**чб**а, ля**гч**эйшы, му**жч**ына, мя**дзведзь**, на рэ**чц**ы, нала**дч**ык, насе**нн**е, но**сьб**іт, нясві**жск**і, па**дп**ісаць, перакла**дч**ык, перапле**тч**ык, пецярбур**гск**і, пра**жск**і, ра**з’я**днаць, ра**сш**ыфраваць, ру**чн**ік, спа**зн**іцца, сталі**чн**ы, **ск**ептык, су**квецц**е, **сх**ема, **сш**ытак, таджы**кск**і, у ло**дц**ы, у пала**тц**ы, у ча**стц**ы, узбе**кск**і, францу**зск**і, фу**тб**ол, чыка**гск**і, э**кз**амен, э**кз**отыка.

***Заданне 6.2***

Прачытайце словы, правільна вымаўляючы ўсе галосныя гукі. Выдзеленыя літары запішыце ў транскрыпцыі.

Аб'**і**нець, ансам**бль**, дзярж**і**нспектар, Іль**і**ч, кіламе**тр**, кра**і**на, мед**і**нстытут, ме**тр**, міні**стр,** Наваполацк **і** Полацк, салаў**і**ны, смех **і** грэх, супер**і**нтэлект, сын **і** брат, сястра **і** брат, цацкі **і** цукеркі.

***Заданне 6.3***

Расстаўце націскі ў словах.

Абагульненне, абагульніць, аб'інець, абруч, абутнік, абух, адзінаццаць, аднаразовы, адскочыць, аер, азбест, айва, алфавіт, аманімія, арахіс, аркуш, асака, атлас, атлас, блытаніна, бульбяны, валасы, вольха, восемдзесят, вусы, выпадак, вярба, гліняны, грамадзянін, дакумент, дачыста, дзеяч, дыспансер, дыялог, дэфіс, жыхар, забеспячэнне, загадзя, занятасць, знахар, іканапіс, ільняны, іменны, імя, індустрыя, інструмент, інсульт, каліграфія, камбайнер, камбала, каменны, каноплі, Капыль, карабель, каршун, касцяны, каталог, каўчук, кашляць, каштарыс, квартал, кішка, крапіва, крыху, крэмень, кулінарыя, кухонны, легіраванне, ліставы, лопух, людскі, Мазыр, маладзенькі, маленькі, малы, маркетынг, мармур, мезенец, металургія, міліметр, мысленне, мышленне, названы, наспех, нафтавы, некалі, некаторыя, некуды, ніколі, нікуды, ноздра, нянавісць, Нясвіж, паліграфія, пароўну, парубка, парэнчы, прыяцель, пяцёра, рубель, рэмень, рэшата, садавіна, саламяны, сантыметр, сівы, сліна, спіна, стары, старэнькі, статут, статуя, сямёра, табу, таварыскі, таварыства, таварыш, Талачын, упрысядкі, урду, фартух, фарфор, феномен, храміраванне, хрысціянін, цагляны, цвісці, цыган, цяжар, чатырнаццаць, чацвёра, шасцёра, шаўковы, шэсцьдзясят, эксперт, ярына.

***Заданне 6.4***

Спішыце, раскрываючы дужкі і выбіраючы вялікую або малую літару. Растлумачце правілы яе напісання. Улічыце магчымасць варыянтаў.

(І, і)ван (Д, д)амінікавіч (Л, л)уцэвіч, (М, м)іцкевічы, (Г, г)арлахвацкія, (К, к)ашчэй (Б, б)ессмяротны, (У, у)ладыка (Н, н)ябесны, (Р, р)усалка, (Дз, дз)ед (М, м)ароз, (С, с)таршыня (П, п)алаты (П, п)радстаўнікоў, (Г, г)енеральны (П, п)ракурор, (Дз, дз)яржаўны (С, с)акратар, (П, п)апа (Р, р)ымскі, С, с)устрэча ў (П, п)рэм'ер-(М, м)іністра, (Р, р)эспубліка (Б, б)еларусь, (Т, т)раецкае (П, п)радмесце, (С, с)вятло (М, м)есяца, (М, м)агілёўскія (В, в)уліцы, (Б, б)лізкі (У, у)сход, (У, у)сходняе (П, п)аўшар'е, (У, у)сходняя (Д, д)аўгата, (Г, г)родзенскі (С, с)тары (З, з)амак, (П, п)алац (Ш, ш)любу, (П, п)аўночнае (М, м)ора, (П, п)аўночная (Ш, ш)ырата, віншуем (В, в)ас, (Б, б)агдановічаў (В, в)ерш, (К, к)упалаўская (С, с)тыпендыя, (Н, н)обелеўская (П, п)рэмія, (Г, г)анаровая (Г, г)рамата, (М, м)едаль «(З, з)алатая (З, з)орка», (К, к)убак (Ф, ф)ІФА, (А, а)парат (М, м)орзэ, (Б, б)ерасцяная (Г, г)рамата, (Б, б)еларуска-(Р, р)асійскі ўніверсітэт,

(К, к)убак (Е, е)ўропы па (Л, л)ёгкай (А, а)тлетыцы, (В, в)ялікае (К, к)няства (Л, л)ітоўскае, (К, к)оласаўскі тэатр, (С, с)тыль (Б, б)арока, (Э, э)поха (А, а)драджэння, (Дз, дз)ень (Н, н)араджэння, (Дз, дз)ень (П, п)ерамогі, (Дз, дз)ень (М, м)ашынабудаўніка, (Н, н)ародны (П, п)ісьменнік, (М, м)едаль «(З, з)а (П, п)рацоўныя заслугі», (П, п)раўленне (Н, н)ацыянальнага (Б, б)анка (Р, р)эспублікі (Б, б)еларусь, (У, у)зброеныя (С, с)ілы (Р, р)эспублікі (Б, б)еларусь, (Т, т)аварыства (Ч, ч)ырвонага (К, к)рыжа і (Ч, ч)ырвонага (П, п)аўмесяца, (Дз, дз)яржаўны (Г, г)імн, (Н, н)ацыянальная (А, а)кадэмія (Н, н)авук Беларусі, (П, п)рэзідэнт (Р, р)эспублікі (Б, б)еларусь, (В, в)ярхоўны (С, с)уд (Р, р)эспублікі (Б, б)еларусь, (В, в)ечны (А, а)гонь, (К, к)урган (С, с)лавы, (Г, г)рамадзянскае (П, п)рава, (Э, э)канамічная (Р, р)эформа, (М, м)іжнародны (К, к)ніжны (К, к)ірмаш, (С, с)усветны дзень (М, м)оладзі (Н, н)апалеонаўскія (В, в)ойны, (Н, н)овы (Г, г)од, (К, к)аменны (В, в)ек, (К, к)рыжовыя (П, п)аходы, (А, а)зойская (Э, э)ра, (П, п)азаземная (Ц, ц)ывілізацыя, (Р, р)анні (Н, н)еаліт, (С, с)тагадовая (В, в)айна, (В, в)ялікая (А, а)йчынная (В, в)айна, (Г, г)еркулесавы (С, с)лупы, (Ф, ф)іламаты і (Ф, ф)іларэты.

***Заданне 6.5***

Спішыце словы, устаўце прапушчаныя літары.

Аксі…ма, а…дыторыя, б…нзін, вары...нт, вас...мнаццаць, вос...мсот, вінчэст...р, в...сьміграннік, ге...метрыя, дз...вятнаццаты, дз…вяты, дз...вяць, дз...лімае, дз…сяты, дз...сяць, дыферэнцы...л, ды...ганаль, ды…метр, ды...пазон, д…манстрацыя, інж…нер, інтэрн…т, ірацы…нальнасць, камп’ют...р, канц…лярыя, кар…ляцыя, кат…т, ка...фіцыент, к…расін, лід...р, майст…р, матэры..л, меды...на, м…тровы, м…ханізм, мн..гаграннік, міл…ярд, м…неджмент, перы…д, пра...кт, пр..порцыя, прынт...р, п...рспектыва, рады…, рады…н, рады...с, рады…цыя, р…сора, рэзюм..., рэнам..., с…гмент, стэрэ…метрыя, с…мнаццаць, с…мсот, с...рвіс, то…снасць, тра…кторыя, трох...лементны, тыс...ча, тэар...ма, ц…рымонія, экз…мпляр.

***Заданне 6.6***

Запішыце словы, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы, дзе неабходна, прапушчаныя літары.

Адн...(фазны), атамна(малекулярны), бенза(маторны), в...да(стойкі), гук...(ізаляцыя), зборна(разборны), крыв...(лінейны), л...гка(плаўкі), ніжн...(складскія), нізк...(сортны), п...ў(метра), п…ў(фабрыкаты), рады...(актыўнасць), рады...(сувязь), ст...(гадовы), ц...пла(праводны), чалавек...(дзень), ч...рна(рабочы), штанген(цыркуль), электр...(магнітны), блок(схема), буйна(габарытны), выс...ка(дакладны), выс...ка(малекулярны), ман...(метр), матэрыяльна(тэхнічны), мн...га(станочны), навукова(даследчы), паў(Беларусі), п...ў(метра), п...ў(праваднік), планав...(стратная), праца(ёмістасць), рады...(антэна), р...ўна(мерны), ст...(градусны), трапецы…(відны), усходн...(славянскі), фізіка(механічны), ц...пла(праводнасць).

***Заданне 6.7***

Пастаўце словазлучэнні ў форме роднага склону.

Абсалютны нуль, айчынны аўтамабіль, бязводны мінерал, ваенны комплекс, вялікі кліранс, грамадскі транспарт, далёкі космас, дыдактычны комплекс, завод гадзінніка, залаты лістапад, крычаўскі цэмент, металічны кантэйнер, магнітны сігнал, мінулы год, магілёўскі завод, моцны вецер, носьбіт інфармацыі, пазаземны кантакт, працоўны час, пропуск на фабрыку, рабочы дыяпазон, свабодны мікрафон, спектральны аналіз, цагляны завод, электрычны зарад, абедзенны перапынак, апошні міліметр, вільготны падвал, вызначаны тэрмін, выцяжны цыліндр, драўляны конус, дубовы плінтус, зжыжаны кісларод, лічбавы код, марскі шторм, матэматычны каэфіцыент, медыцынскі рэнтген, месяц лістапад, пропуск заняткаў, рабочы інвентар, сумарны люфт, такарны станок, тонкі контур, тэрміновы рамонт, тэхнічны тэрмін, электрычны нагрэў, якасны шыфер.

***Заданне 6.8***

Запішыце назоўнікі ў родным, творным і месным склонах.

Абзац, апрацоўка, базальт, Беларусь, вапна, вертыкаль, восем, выраб, вытворчасць, глыб, дагавор, кварц, клінкер, майстар, навеска, Нарач, плітачнік, подпіс, праектар, раствор, слоўнік, спецыяліст, транспарт, фракцыя, якасць, аспірантура, ацэнка, бюджэт, ваўчаня, гутарка, дроб, дырэктар, жыццё, квецень, лексіка, ліцэнзія, любоў, навык, прафесар, псіхіка, пясок, свінец, сувязь, шчаня, шынель, увага, характарыстыка.

***Заданне 6.9***

Спішыце, устаўляючы, дзе трэба, замест кропак літары ы, і, й або ў, у.

Ад..ходзіць, без..менны, пра..люстраваць, за..нець, за..скрыцца, за..граць, пера..начыць, непры..мальны, без..нерцыйны, ад..менны, з..мправізаваць, дэз..нтэграцыя, суб..нспектар, супер..нтэлект, контр..гра, між..нстытуцкі, звыш..нфляцыя, аквары..м, калёкві..м, ная..насць, а..дытар, бакала..р, іонна-...каранёны, інтэграл Га..са, кента…р, натары…с, пакга…з, сімпозі…м, словы «калі ласка» ...разілі мяне.

***Заданне 6.10***

Пастаўце наступныя прозвішчы і імёны ў патрэбнай склонавай форме.

Даклад (Буглакова Вольга, Бухта Наталля, Данусевіч Андрэй, Паўлушчанка Алена, Муха Таццяна, Даніленка Сяргей, Чачко Марыя, Ільіна Маргарыта, Шарстук Святлана, Місянчук Дзмітрый); пасведчанне выдадзена (Маджуга Інга, Зенчанка Вікторыя, Саладуха Сцяпан, Страха Любоў, Мілюць Алеся, Жарыкава Ія, Бяда Уладзімір, Заяц Віктар, Цымбаленка Вадзім, Ярома Ганна); убачыць (Шурмей Ала, Булыка Валянціна, Палукошка Ларыса, Арцем’еў Павел, Лазічная

Аксана, Філіпенка Рыгор, Рэгета Валерыя, Турбіна Алена, Булай Раман); сустрэцца з (Аскірка Анатоль, Хвалей Мікалай, Рыбка Васіль, Даніленка Кацярына, Акула Ігар, Хомчанка Ірына, Дукса Марыя, Валожын Захар, Палуян Тарас, Данскіх Дзмітрый); расказаць аб (Каліценя Аляксандр, Каліценя Аляксандра, Шырко Іван, Оршын Сцяпан, Аўрамчык Максім, Якубенка Марына, Папраўка Кузьма, Шылец Ілья, Мянчэня Леанід, Гайс Генадзь).

***Заданне 6.11***

Ад назоўнікаў утварыце прыметнікі пры дапамозе суфіксаў, падбярыце да ўтвораных прыметнікаў адпаведныя назоўнікі і запішыце.

Формула, славяне, матэматыка, сетка, іголка, грань, латынь, спектр, біном, ланцуг, салон, крытыка, краты, базіс, нуль, структура, вектар, сімвал, сіметрыя, дысперсія, універсал, цыкл, фундамент, адзінка, фаза, цыліндр, ступень, квадрат, шар.

***Заданне 6.12***

Перакладзіце сказы на беларускую мову, запішыце іх. Вызначце ступені параўнання прыметнікаў.

1 Белорусско-Российский университет – один из популярнейших вузов нашей республики.

2 Софийский собор в Полоцке – одна из древнейших каменных построек в нашей стране.

3 Днепр в Киеве значительно шире Днепра в Могилеве.

4 Старый друг лучше новых двух.

5 Студенты готовились к наиболее трудной за весь период обучения сессии.

6 Сестра была старше меня на четыре года.

7 Добрая слава дороже богатства.

8 Спасо-Преображенский кафедральный собор – самый высокий в городе Могилеве.

9 Могилевское производственное объединение «Химволокно» известнее многих других предприятий Беларуси.

10 Зачет по белорусскому языку – один из сложнейших в контексте обучения студентов технических специальностей.

***Заданне 6.13***

Ад назоўнікаў, што ў дужках, утварыце прыналежныя прыметнікі, дапасуйце іх да наступных назоўнікаў, словазлучэнні запішыце.

(Алеся) сшытак, (бабёр) азёры, (Колас) паэма, (мама) ласка, (мядзведзь) бярлога, (сабака) хвост, (старшыня) загад, (Сцёпка) ліст, (сяброўка) падарунак, (Фядора) гора, (Аленка) кніга, (Алесь) мапед, (дачка) паліто, (жонка) сукенка, (ліса) след, (Мележ) стыль, (сініца) гняздо, (Сяргей) лодка, (сябар) дапамога, (цётка) гасцінец.

***Заданне 6.14***

Спішыце, раскрываючы дужкі. Лічэбнікі запішыце словамі. Улічыце магчымыя варыянты спалучэння лічэбнікаў з назоўнікамі.

284 (новая кніга), 25 (карцінамі), у 1995 годзе, з 8 аднакурснікамі; няма і 1,5 (вядро); на 1,5 (старонка); з 53 падручнікамі; 1/3 (заданне); праз 1,5 (стагоддзе); 7,3; каля 10 старонак; з 14 да 18 гадзін; каля 55 працэнтаў; 2/3 (усё дарослае насельніцтва); прыкладна 38 (працэнты); 3 (лепшы малюнак); абодва (мастак-авангардыст); 72 (экземпляр); абедзве (знакамітая актрыса); 782 (старонкі); 904 (кілаграм); 2 (стол); 17 (вучань); 43 (рубель); 2/4 (гектар); 34 (нажніцы); прадстаўлена 237 экзэмплярамі; засеяць на 462 гектарах; 23,5 (цэнтнер) з гектара; 602 (кіламетр); 18 (студэнт); 3 (цяля); 4,8 (цэнтнер); 1,5 (год); 125 (тысячны) наведвальнік; 247 (метровая) адлегласць; каса з 587 мільёнамі рублёў; 22 (лыжы); 0,3 (кілагарам).

***Заданне 6.15***

Запішыце лічбы словамі ў патрэбным склоне.

Назоўны склон: 11; 50; 300; 1; 18; 300.
Родны склон: 4; 90; 700;1,5; 50; 100.
Давальны склон: 3; 10; 800; 40; 60; 830.
Вінавальны склон: 19; 77; 900; 24; 254; 1000.
Творны склон: 48; 87; 111; 6; 25; 569.
Месны склон: 8; 357; 490; 90; 200; 1000000000.

***Заданне 6.16***

Утварыце ад лічэбнікаў з назоўнікамі складаныя прыметнікі і падбярыце да іх назоўнікі. Запішыце ўтвораныя словазлучэнні.

*Узор выканання*: *50 год − пяцідзесяцігадовы юбілей.*

2 гадзіны, 14 кіламетраў, 29 градусаў, 70 грам, 50 працэнтаў, 72 кватэры, 3 сутак, 9 паверхаў, 120 метраў, 40 тон, 11 тамоў, 2 саставы.

***Заданне 6.17***

Перакладзіце на беларускую мову.

1 Мне не к кому больше приехать.
2 А я кое-что хочу тебе рассказать.
3 Думаю, кое-кому моя речь совсем не понравилась.
4 Не с кем было слово перемолвить, не то что душу отвести.
5 В письме с дома были кое-какие новости.
6 Некому было помочь Надежде Петровне, весь груз семейных забот она тащила на своих плечах.
7 Я тут посоветовалась кое с кем.
8 Больше ждать Ниловне было некого.
9 Нечего плакать без причины.
10 Своих тьма, а приходится топиться – не за кого ухватиться.

***Заданне 6.18***

Перакладзіце дзеясловы на беларускую мову.

Вписывать, вымащивать, восстанавливать, высказывать, обнаруживать, обосновывать, отбрасывать, подчёркивать, придумывать, рассматривать, складывать, согласовывать, увеличивать, устанавливать, логарифмировать, конструировать, координировать, конкретизировать, кодировать, компанировать, ассоциировать, рецензировать, планировать, суммировать, проектировать, альтернировать, устанавливать, направлять.

***Заданне 6.19***

Перакладзіце на беларускую мову словазлучэнні з дзеепрыметнікамі. Растлумачце выкарыстанне суфіксаў беларускамоўных адпаведнікаў.

Абсолютно поглощающий, суммируемый, сходящийся, алгебраически замкнутый, асимптотически несмещенный, вполне интегрируемый, разложимый, упорядоченный, волна расходящаяся, база открытая, алгоритм инвертирующий, пространство классифицирующее, представление неприводимое, неразложимое, отображение растягивающее, сжимающее, цикл исчезающий, сходящийся.

***Заданне 6.20***

Утварыце ад дзеясловаў дзеепрыслоўі, запішыце іх. Абазначце суфіксы, пастаўце націскі.

Штрыхаваць, характарызаваць, адлюстраваць, размеркаваць, рассейваць, спалучаць, параўнаць, вырашаць, выявіць, вымяраць, абагульняць, вылічваць, абвяргаць, зрушыць, адасобіць, замыкаць, ушчыльняць, кіраваць, ізаляваць, даказаць, звязаць, заштрыхаваць, ахарактарызаваць, адлюстроўваць, размяркоўваць, рассеяць, спалучыць, параўноўваць, выяўляць, вымераць, абагуліць, вылічыць, замкнуць.

***Заданне 6.21***

Перакладзіце на беларускую мову дзеепрыслоўныя словазлучэнні.

Определяя стратегию, вычисляя степень, находя решение, описав событие, остановившись на системе, решая неравенство, изучив метод, найдя скорость, наблюдая сдвиг, расходясь в ответах, раскрывая неопределенность, разместив в пространстве, направляя вектор, дополнив задание, спроектировав изображение, вычисляя произведение, принимая во внимание, исходя из условия, не обратив внимание, не ограничивая общность рассуждений, подставив эти значения в формулу, суммируя вышесказанное, учитывая это, включая полученные результаты.

***Заданне 6.22***

Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.

Благодарить товарища, больной гриппом, больше нормы, в двух шагах от здания, в ответ на запрос, в течение квартала, видеть своими глазами, выше дуба, говорить о науке, идти по лесам, испытать беду, лет около пятидесяти, меньше мензурки, навестить коллегу, невзирая на просьбу, пойти за грибами, пойти за документами, посылать по адресу, прислониться к стене, смотреть сквозь очки, четыре новых машины, апеллировать к общественной мысли, в девятом часу утра, в течение зимы, высохнуть в щепку, ехать лошадью, думать о будущем, жениться на хорошей девушке, заболеть корью, идти за земляникой, из глубины комнаты, из зависти к другу, лёгок на помине, охотиться за лисой, перетереть в муку, по моему суждению, по одноимённому роману Ивана Мележа, по случаю встречи, смеяться над самим собой, тоска по Родине, ухаживать за девушкой, ходить по домам.

***Заданне 6.23***

Знайдзіце словазлучэнні без памылак, улічваючы асаблівасці беларускага кіравання. Запішыце з улікам сінтаксічных нормаў.

Выконваць па ўзору, два разы ў тыдзень, дом у тры паверхі, ён па-за канкурэнцыі, загадчык кафедрай, збіраецца к дажджу, здольны к усяму хлопец, зрабіць што-небудзь па памылцы, крычаць ва ўвесь голас, купіць паліто па выбару, лятаць па паветры, падабенства да бацькі, па заканчэнню ўніверсітэта, парассаджваць усіх па месцах, прыняць ва ўвагу, розніца ў двух гадах, рыхтавацца к заняткам, сватацца за яе, сутыкнуцца тварам да твару, фасон не па густу.

***Заданне 6.24***

Спішыце сказы, каардынуючы выказнік з дзейнікам. Растлумачце, чаму у адных сказах выказнік ужываецца ў адзіночным ліку, а ў другіх – у множным.

1 Дзве дзявочыя постаці (мільгануць) на фоне лугавой зеляніны.

2 Праз хвіліну яму добра відаць, што (ісці) двое людзей.

3 Трое астатніх з цікавасцю (разглядаць) незнаёмых ім людзей.

4 (Быць) у бацькі дзве дачкі.

5 Чалавек з пяць не (прыйсці) на паседжанне кафедры.

6 Шмат хат (прытуліцца) да сцяны лесу.

7 Сямёра дзяцей (стаяць) побач са школай.

8 З таго часу (прайсці) якіх са тры гадзіны.

9 Лясное птаства (расшчабятацца) – відаць, на пагоду.

10 Чацвёрка коней (стаяць) як укопаная перад самай хатай.

11 Каля заросшым дрэвамі двары (стаіць) тры дзяўчынкі.

12 Кольку з дзедам (спыніць) некалькі чалавек.

13 Герасімаўна з Іванавічам (пайсці), а стары Міканор усё яшчэ стаяў на ганку хаты, праводзячы іх сяброўскім позіркам.

14 Пасля раптоўна ля самага стога (вырасці) некалькі постацей.

15 Наперадзе (ісці) два хлопцы і (гаварыць) пра дзяўчат.

*Заданне 6.25*

Падбярыце беларускія адпаведнікі да прыведзеных рускіх словазлучэнняў.

Вынужденные колебания, измельченный клинкер, невидимый луч, осознанная ошибка, поступательное движение, проведенный эксперимент, странствующий музыкант, угрожающее положение, «Унесенные ветром» (Маргарет Митчелл), «Несущий смерть» (Стивен Кинг), выдающийся конструктор, затухающие колебания, полученная масса, пониженная температура, почитаемый мастер, соответствующие выводы, трудящийся человек, «Затерянный мир» (Конан Дойль), «Спящая красавица» (Шарль Перро).

## 7 Лексічная сістэма беларускай мовы

*Заданне 7.1*

Перакладзіце словазлучэнні аднаслоўнымі беларускімі адпаведнікамі.

Кирпичный завод; книжный магазин; стая перелетных птиц; бумажная фабрика; летучая мышь; растительное масло; железная дорога; удар грома; в этом году; детеныш белки; напиток из березового сока; пребывание в гостях; довести до нервного состояния; лишить свободы; католический монастырь; стоять на коленях; заготовка сена; жестяная банка; крепостное право; большое высотное здание; ручная мельница; свиное рыло; носовой платок; легковая машина; двор около дома; заливной луг; стекло в оконной раме; канун весны; падающая звезда; майский жук.

*Заданне 7.2*

Прачытайце наступныя сінанімічныя рады. Назавіце адрозненні ў адценнях значэння прыведзеных сінонімаў. Ці ўсе з прыведзеных сінонімаў і блізказначных слоў абсалютна ўзаемазамяняльныя?

Дапамога, помач, падтрымка, падтрыманне, выручка, садзеянне, падмога, успамога, спамога; дарога, шлях, шаша, шасэ, шасейная дарога, аўтастрада, аўтамагістраль, аўтабан, тракт, гасцінец, бальшак, прасёлак, паваротка, паваротак, артэрыя, пуць, пуціна, пуцявіна.

*Заданне 7.3*

Спішыце словазлучэнні, замяняючы выдзеленыя словы антонімамі.

*Старая* кніга, *старая* газета, *стары* чалавек; *сухі* плашч, *сухі* хлеб, *сухі* клён; *свежае* малако, *свежае* паветра, *свежае* мяса; *ясны* дзень, *ясныя* пытанні, *ясны* твар; чытаць *ціха*, сядзець *ціха*, ісці *ціха*.

*Заданне 7.4*

Вызначце тыпы амонімаў (лексічныя: поўныя ці няпоўныя; амаформы, амафоны, амографы).

Смачныя лісічкі – хітрыя лісічкі; стройны стан – варожы стан; хутчэй тры – тры чалавекі; дзіцячыя казкі – салдацкія каскі; жытняя мука – адна мука; баявыя гранаты – спелыя гранаты; за тым дрэвам – затым ён сказаў; варта спынілася – варта спыніцца; цёплая байка – цікавая байка; салдаты брылі – саламяныя брылі; пякучая крапіва – напісаў Крапіва; апёк руку – глыбокі апёк; доўгая каса – ашчадная каса; пчаліныя соты – соты ў спісе; галіна дуба – галіна ведаў; горкі лёс – слізкія горкі; не мець запасу – плаўленая медзь; заплесці касу – затачыць касу; разгадаць код – пародзісты кот; маладыя асіны – асіны рой.

***Заданне 7.5***

З паронімаў, змешчаных у дужках, выберыце тыя, якія адпавядаюць сэнсу сказа. Запішыце правільныя варыянты.

1 Рэгістрацыя (камандзіраваных, камандзіровачных) праходзіць у вестыбюлі.

2 Памеры (платы, аплаты) за рамонт бытавых электрапрыбораў вызначаны дзеючым прэйскурантам.

3 У кузаве грузавіка можа (памесціцца, размясціцца) чатыры «Масквічы».

4 У праграму даследаванняў уключана вывучэнне (акіянскіх, акіянічных) цячэнняў.

5 У новых раёнах горада Магілёва будуць адкрыты (спецыялізаваныя, спецыяльныя) магазіны па продажу мэблі.

6 Каб дабіцца поспеху, трэба (прыняць, прадпрыняць) (эфектныя, эфектыўныя) меры.

7 Кантроль якасці ажыццяўляецца метадам (выбарнай, выбарчай, выбарачнай) праверкі вырабаў.

8 Праметэй – адзін з галоўных герояў (міфічнай, міфалагічнай) традыцыі старажытных грэкаў.

9 Салдаты выстраіліся на вячэрнюю (паверку, праверку).

10 Кожны год мы набываем (абаненты, абанементы) на цыкл канцэртаў.

***Заданне 7.6***

У табліцы 4 запішыце па два прыклады на кожную лексічную падгрупу.

Табліца 4 – Лексіка беларускай мовы

<table>
<tr><td colspan="6">Падзел лексікі па паходжанні</td></tr>
<tr><td colspan="2">Спрадвечна беларуская</td><td colspan="2">Запазычаная</td><td colspan="2">Безэквівалентная</td></tr>
<tr><td colspan="6">Падзел лексікі па ступені ўжывання</td></tr>
<tr><td colspan="3">Актыўная</td><td colspan="3">Пасіўная</td></tr>
<tr><td colspan="6">Падзел лексікі па стылістычнай прыналежнасці</td></tr>
<tr><td colspan="3">Стылістычна нейтральная</td><td colspan="3">Стылістычна афарбаваная</td></tr>
<tr><td colspan="6">Падзел лексікі па сферы выкарыстання</td></tr>
<tr><td colspan="2">Спецыяльная</td><td colspan="2">Дыялектная</td><td colspan="2">Жаргонная</td></tr>
</table>

***Заданне 7.7***

Размяркуйце словы па наступных групах: а) словы актыўнага ўжывання; б) архаізмы; в) гістарызмы; г) неалагізмы.

Крыўдны, бяспека, форс-мажор, авердрафтны, інсургент, выстава, адвакат, менеджар, сітуацыйны, воласць, лёкай, камсамол, пілінг, павуціна, магнат, ліцэй, вуліца, перст, чало, ліст, вокладка, абярог, асвоіцца, сушы, актывізаваць, хакер, халява, вой, скотч, забаролы, заводскі, стаміцца, харызматычны, цана, атрамант, вакацыі, сведка, інтэрактыўны, дазволіць, звальненне, павет, ажыятаж, дзядуля, хутар, продкі, вусны, звесткі, арыенцір, магістратура, мюслі, навучанне, крэатыўны, засценак, курсор, смартфон, стольны, патыліца, немаўля, шпроты, стомленасць, кастынг.

***Заданне 7.8***

Прачытайце фразеалагізмы, вызначыце, што абазначалі выдзеленыя словы.

*Аршын* з шапкай, чортава *процьма*, сем *футаў* пад кілем, ад гаршка *паўвяршка*, ні на *гран*, чортаў *тузін*, ні *пядзі* (не аддаць), сорак *саракоў* (чаго), касы *сажань* у плячах, сем *бочак* арыштантаў (нагаварыць), паказаць пачым *фунт* ліха (каму), сем *вёрст* да нябёс і ўсё лесам, сем *карабоў*.

***Заданне 7.9***

Вызначце значэнне фразеалагізмаў. Укажыце, з якой прафесіі яны могуць паходзіць.

Шыта (сшыта) белымі ніткамі. Чыстай (самай чыстай) вады. Ціхай сапай. Удар пад дых. У ажуры. Трымаць руку на пульсе. Спісваць (спісаць) у тыраж. Скідаць (скінуць) з рахунку. Па гарачых слядах. На ўсе коркі. На поўную (усю) катушку. Легчы (залегчы) на дно. Круціць баранку. Кідаць (кінуць) якар. Камар носа не падточыць (не падсуне). Іграць першую скрыпку. Зялёная вуліца. Зроблены на адзін капыл. З месца ў кар’ер. Здымаць (знімаць, зняць) стружку з каго. Заліваць кулі. Закручваць (закруціць) гайкі каму. Даваць (даць) задні ход. Даваць (даць) газу. Да белага калення даводзіць (давесці). Выходзіць (выйсці) на арбіту. Высокай пробы. Выдаваць (выдаць) нагара. Вешаць нос на квінту. Бярозавая каша. Браць (узяць) на мушку. Браць (узяць) быка за рогі. Без сучка і <без> задзірынкі. Агнём і мячом.

***Заданне 7.10***

Запішыце ўстойлівыя словазлучэнні (лічэбнікі пішыце словамі, улічыце, што яны могуць быць як колькасныя, так і парадкавыя). Растлумачце сэнс атрыманых устойлівых словазлучэнняў.

1 поля ягады. 1 шчасце. 1 вочы блішчаць. 1 махам. З 1 рук. Зорка 1 велічыні. Іграць у 1 дудку. На 1 зуб. На 1 капыл. На 1 твар. На 1 погляд. Стаяць 1 нагой у магіле. У 1 рукі. Гнацца за 2 зайцамі. Між 2 агнёў. Як 2 кроплі вады. Ясна, як 2 × 2.

Згінацца ў 3 пагібелі. У 4 сценах жыць. 5 кола ў возе. Ведаць як свае 5 пальцаў. З 5 на 10. Шукаць 5 кут. 7 вада на кісялі. 7 пядзяў лоб. 7 пятніц на тыдні. Адчуваць сябе на 7 небе. Да 7 поту. За 7 замкамі. За 7 пячаткамі. 10 заказаць.

## 8 Тэрміналогія як вядучы складнік прафесійнага маўлення

***Заданне 8.1***

Перакладзіце тэрміны з рускай мовы на беларускую.

Автоволны, аккомодация, альфа-лучи, ампер-весы, беккерель, блеск, вакуум, ватт, вероятность, вещество, влажность, волокно оптическое, восстановление, гаусс, голография, джоуль, диффузор, емкость, жаропрочность, жидкость, жир, замедление времени, излучатель, измерение, инфразвук, ион, ионизация, катушка индуктивности, квантование, килограмм, кипение, колебания, коллайдер, коллоид, конденсатор, континуум, коэффициент, ловушка, луч, напряжение, невесомость, облучение, оболочка, осциллограмма, ось, параллелограмм, парообразование, перпетуум-мобиле, плотность, подуровень, полупроводник, последствие, превращение, прозрачность, промежуток, радиоволны, радиометрия, радионуклид, расстояние, расщепление, резистор, светоизлучающий, скорость, смещение, сопротивление, степень, стержень, теплоноситель, тиристор, уплотнение, управление, упругость, устройство, фотодиод, фотоэффект, хрупкость, центростремительность, число, щелевой, электричество, электропроводимость, эффузия, ядерное топливо.

***Заданне 8.2***

Суаднясіце сучасныя тэрміны з найменнямі, што выпрацоўваліся ў 20-я гг. XX ст. Пары слоў запішыце.

Бісектрыса, вадзіцель, ваўчок, вертыкальны, вінт, ворат, дыяметр, зажым, катэт, каэфіцыент, квадрант, кіпяцільнік, клапан, конус, магніт, магутнасць, маятнік, накал, паветраплаванне, перпендыкуляр, полюс, прызма, радыус-вектар, ртутны, рэастат барабанны, спіраль, супраціўленне, трубка вадамерная, трэнне знешняе, уплыў зараду, фокус, цыліндр, шкло ўвагнута-выпуклае, шчолачны, эксцэнтрысітэт.

*Словы для даведак:* валец, варнік, вогнішча, жывасрэбны, затамка, заціскач, калаўрот, кантаслуп, канцавосць, кіроўца, лётніцтва, лужны, магнэс, махавік (вагальнік), мімасяроднік, напал, патужнасць, прамень, прамер, простападны, прыпростакутная, раўнасечная, рурка вадамерная, рухомы, рэастат валачны, скрутка, стажок, старчак, супор, трэнне знадворнае, турок, уплыў набою, чвэртка, чыннік, шкло ўвагнута-лупатае, шруба.

***Заданне 8.3***

Да прыведзеных тэрмінаў падбярыце беларускія адпаведнікі. Запішыце іх.

Абарыген, амплуа, апатыя, бард, басейн, болт, вакуум, вердыкт, вернісаж, вінт, гіпербала, дрэнаж, дзюна, дыплом, дысертацыя, дыяфрагма, дэкор, ватэрпас, інкрустацыя, іронія, ірыгацыя, каморнік, камуфляж, карозія, каталог, кювет, ландшафт, ліміт, літота, мемуары, метафара, міграцыя, монасемія, нівелір, паркінг, парытэт, полісемія, прыбор, прэфікс, равелін, рэстаўрацыя, сентыментальны, сімуляцыя, сорт, стацыянар, флексія, цагельня, эмбрыён, эліпсіс, эскіз.

***Заданне 8.4***

Да прыведзеных тэрмінаў падбярыце антонімы. Запішыце іх.

Абсалютны максімум, аварыйны, адніманне, адшрубоўванне, акісленне, асіміляцыя, аэрыраванне, баланс, будынак аднапавярховы, варыянт, водааддача, дзяленне, дуга, зборка, кадаванне, камфартабельны, мяккасць, мантаж, награвальнік, нагрэў, паскаральнік, патанчэнне, разгрузка, рамонт, сіметрычнасць, сіметрыя, спарадычны, стыкаванне ўпрытык, траўленне глыбокае, уваход, уключальнік, унутрывідавы, фаза, фільтрацыя, цепластойкасць, цеплаўстойлівасць, штампоўка задняя.

***Заданне 8.5***

Утварыце з прыведзенымі словамі словазлучэнні так, каб у адным выпадку яны былі тэрміналагічнымі, а ў другім − нетэрміналагічнымі.

*Узор*: *Рэжым – тэкставы рэжым*, *рэжым дня.*

Аўтамат, алфавіт, аналіз, ансамбль, аплікацыя, атлас, база, бар’ер, бераг, блок, веер, віхар, хваля, выклік, выраз, выхад, граф, груда, дрэва, дэталь, дыск, даклад, дуга, закон, зарад, крыніца, катастрофа, клас, дыван, каманда, комплекс, корань, каса, край, крыж, крыло, крук, стужка, ліст, машына, метрыка, мадэль, нумар, вось, пара, поле, шлях, размеркаванне, разбег, ружы, парастак, сетка, дужка, цела, вузел, фокус, форма, характар, ланцуг, крок, шум.

***Заданне 8.6***

Карыстаючыся слоўнікамі, вызначце паходжанне наступных тэрмінаў і іх значэнне.

Абсцыса, аксіёма, алгарытм, апафема, апліката, арктангенс, біном, бісектрыса, вектар, градус, графік, гіпатэнуза, гіпербала, дыферэнцыял, дыяганаль, дыяметр, інтэграл, каардынаты, катэт, каэфіцыент, квадрат, конус, лагарыфм, максімум, мантыса, маса, матрыца, непер, паліном, парабала, перпендыкуляр, перыметр, прагрэсія, прапорцыя, прызма, піраміда, радыус, радыян, ромб, сегмент, секанс, сектар, скаляр, сфера, сінус, тангенс, трыганаметрыя, тэарэма, формула, функцыя, фігура, цыліндр, цэнтр, экспанента, экстрэмум.

*Заданне 8.7*

Размяркуйце тэрміны паводле спосабу ўтварэння, вынікі зафіксуйце ў табліцы 5.

Таблица 5 – Спосабы ўтварэння тэрмінаў

| Лексіка-семантычны | Марфалагічны | Сінтаксічны |
|---|---|---|
| | Суфіксальны | |
| | Нульсуфіксальны | |
| | Прыставачны | |
| | Прыставачна-суфіксальны | |
| | Аснова- і словаскладанне | |
| | Абрэвіяцыя | |

Абліцоўваць, абястлушчыць, аддзелачнік, аддзелка, адкручванне, адліўка, АК, акумулятар, антыакісляльнік, арматуршчык, аўтапагрузка, барабан (тармазны), баранчык (гайка з двума вушкамі), БелАЗ, бетонаўкладчык, будаўнік, бык (апора маста), бясколерны, вадкі, вежавы, вентылятар, вібраштампаванне, вымяральнік, выпрасоўка дэталі, выпукласць, галава (балта), глыбіня, гравіямойка, грэйдар, дах будынка, ДБК, двухтаўровы, дысацыяцыя, дысбаланс, дэкампрэсар, дэмантаж, жалезабетон, заглушыць, зазямленне, заклеіць, замес, звышправодны, звышустойлівасць, ізалятар, індустрыялізацыя, інжынерная геадэзія, кавальскі, кажух (пакрыццё з жалеза для ізаляцыі), камяністы, кандэнсатар, кладка валікам, клёпка, кранаўшчык, кулачок (дэталь машыны), лакіроўка, лобзік, МАЗ, малако (вапняковае), маркіроўка, мост (дэталь машыны), МТЗ, мураваць, нага (кроквенная), наладка, неаднароднасць, омметр, падаконнік, падкрылак, паркетчык, паўзун (дэталь машыны), паяльнік, пісталет (будаўнічы інструмент), плаўкі, прадзіманне, пракладка, развілак, раздрабіць, ратацыйная выцяжка, раскатка, распыліць, растворамяшалка, расфарбаваць, скос, спектраграфія, сталёвы, стомленасць (матэрыялу), стык, стыкоўваць, супрацьпажарны, тачыльшчык, травільшчык, трубазварка, трываласць (металу), тэрмаапрацоўка, ферма (будаўнічая канструкцыя), ХБМ, цеста (цэментнае), цэменціраваць, цясляр, чарпак (экскаватара), шарыкападшыпнік, шкловалакно, шрубавёрт, штапік, шумамер, шчыльнасць.

*Заданне 8.8*

Размяжуйце тэрміны, наменклатурныя назвы, прафесіяналізмы.

Алгебраічная геаметрыя, біномны каэфіцыент, вялікія ЭВМ, духавыя станы, кулонаўскія цэнтры, артаганальны вектар, дзесятковы дроб, лазер («Дыполь», «Фатон-2»), праграмны комплекс, дыферэнцыял, кангруэнтнасць, прыдатныя дробы, вінда, клава, ураўненне (Дзірака, Хіла), дыфуры, матан, рэзак, транс, венік, мыла.

*Заданне 8.9*

Як вядома, некаторыя фразеалагізмы ўтварыліся ў выніку метафарызацыі тэрміналагічных спалучэнняў з розных галін навукі. Укажыце паходжанне і значэнне фразеалагізма, прамое значэнне тэрміна.

Зорка першай велічыні, міна запаволенага дзеяння, разведка боем, цэнтр цяжару, выйсці са строю, задача са шматлікімі невядомымі, залаты фонд, лакмусавая паперка.

*Заданне 8.10*

Зрабіце пераклад спецыяльнага тэксту на беларускую мову з улікам асаблівасцей трансфармацыі беларускай граматычнай сістэмы пры перакладзе.

По степени управляемости электропривод может быть:

1) нерегулируемый – для приведения в действие исполнительного органа рабочей машины с одной рабочей скоростью, параметры привода изменяются только в результате возмущающих воздействий;

2) регулируемый – для сообщения изменяемой или неизменяемой скорости исполнительному органу машины, параметры привода могут изменяться под воздействием управляющего устройства;

3) программно-управляемый – управляемый по заданной программе;

4) следящий – автоматически обрабатывающий определенное перемещение исполнительного органа машины с определенной точностью в соответствии с произвольно меняющимся заданным сигналом;

5) адаптивный – автоматически избирающий структуру или параметры системы управления при изменении условий работы машины с целью выработки оптимального режима.

Можно классифицировать электроприводы и по роду передаточного устройства. В этом смысле электропривод бывает:

1) редукторный, в котором электродвигатель передает вращательное движение передаточному устройству, содержащему редуктор;

2) безредукторный, в котором осуществляется передача движения от электродвигателя либо непосредственно рабочему органу, либо через передаточное устройство, не содержащее редуктор.

По уровню автоматизации можно различать:

1) неавтоматизированный электропривод, в котором управление ручное (в настоящее время встречается редко);

2) автоматизированный электропривод, управляемый автоматическим регулированием параметров;

3) автоматический электропривод, в котором управляющее воздействие вырабатывается автоматическим устройством без участия оператора.

## 9 Гісторыя і сучаснасць беларускай тэрміналогіі і тэрмінаграфіі

*Заданне 9.1*

Вызначыце, прыкладам слоўнікаў якога тыпу з’яўляюцца наступныя выданні.

1 Беларускі арфаграфічны слоўнік : новае арфаграфічнае напісанне / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Беларуская навука, 2012. – 694 с.

2 Булыко, А. Н. Современный русско-белорусский политехнический словарь / А. Н. Булыко. – Минск : Харвест, 2007. – 425 с.

3 Міфалогія беларусаў : энцыклапедычны слоўнік / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – 607 с.

4 Савіцкі, М. І. Тлумачальны слоўнік па інфарматыцы. 2-е выд. / М. І. Савіцкі. – Мінск : Медыял, 2014. – 418 с.

5 Хрусталев, Б. М. Русско-белорусский словарь по инженерно-техническому оборудованию, системам и процессам ; Беларуска-рускі слоўнік па інжынерна-тэхнічным абсталяванні, сістэмах і працэсах / Б. М. Хрусталев, М. Г. Пшоник. – Минск : Беларуская навука, 2009. – 698 с.

***Заданне 9.2***

З прапанаваных слоў складзіце схему «Віды слоўнікаў».

Арфаэпічныя, энцыклапедычныя, тлумачальныя, перакладныя, тэрміналагічныя, этымалагічныя, двухмоўныя (шматмоўныя), лінгвістычныя, універсальныя (агульныя), марфемныя, словаўтваральныя, галіновыя, арфаграфічныя, фразеалагічныя.

***Заданне 9.3***

Разгледзьце малюнак 2. Вызначце, што значаць тэрміны, якія абазначаюць элементы рухавіка. Перакладзіце іх на беларускую мову, патлумачце значэнне. Запішыце, да якіх слоўнікаў неабходня звяртацца ў падобных выпадках.




Малюнак 2 – Рухавік унутранага знарання

***Заданне 9.4***

На прапанаваныя словы распрацуйце слоўнікавыя артыкулы для энцыклапедычнага і тэрміналагічных тлумачальнага і перакладнога (беларуска-рускага) слоўнікаў.

*Узор*: Тэрміналагічны тлумачальны слоўнік: Выпраменьванне – працэс выпрамянення і распаўсюджвання ў прасторы энергіі ў выглядзе хваль і часціц. Тэрміналагічны перакладны слоўнік: Выпраменьванне – излучение.

Аберацыя, акустыка, амплітуда, рух, ціск, квант, магутнасць, паўправаднік, тэрмадынаміка.

## 10 Функцыянальныя стылі беларускай літаратурнай мовы

***Заданне 10.1***

Запоўніце табліцу 6.

Табліца 6 – Функцыянальныя стылі беларускай літаратурнай мовы

| Стыль | Сфера выкарыстання | Мэты зносін | Стылявыя рысы | Моўныя сродкі | Асноўныя віды тэкстаў |
|---|---|---|---|---|---|
| Мастацкі | | | | | |
| Публіцыстычны | | | | | |
| Навуковы | | | | | |
| Афіцыйна справавы | | | | | |
| Гутарковы | | | | | |

***Заданне 10.2***

Вызначце стыль маўлення ў прапанаваных тэкстах. Абгрунтуйце сваё меркаванне.

1 Неўзабаве мы спыніліся ў цудоўнай залатой дуброве. Сярод векавых дубоў, упрыгожаных вялізнымі густымі кронамі, зрэдку сустракаюцца клёны, ясені, сосны, бярозы. Зямля пакрыта тоўстым пластом лістоў і спелымі жалудамі. Сонечнае святло бясконца пранікае шырокімі палосамі паміж магутных ствалоў, залатымі праменямі паціху сеецца скрозь шчыльную лістоту.

2 Дняпро – адна з найбуйнейшых рэк у свеце. Па даўжыні яна займае ў Еўропе трэцяе месца пасля Волгі і Дуная. Даўжыня Дняпра – 2 201 кіламетр, на тэрыторыю Беларусі прыпадае 697 кіламетраў. Пачынаецца Дняпро ў Смаленскай вобласці з невялікага балота на вышыні 240 метраў над узроўнем мора, а ўпадае ў Чорнае мора.

3 Артыкул 2. Кожны чалавек павінен валодаць усімі правамі і ўсімі свабодамі, што абвешчаны гэтай Дэкларацыяй, без якога б там ні было адрознення як, напрыклад, у адносінах расы, колеру, скуры, полу, мовы, рэлігіі, палітычных або іншых перакананняў, нацыянальнага або сацыяльнага паходжання, маёмаснага, саслоўнага або іншага становішча.

*Заданне 10.3*

Суаднясіце характэрныя прыметы з адным з функцыянальных стыляў тэксту.

Ацэначнасць, строгая дакладнасць, лагічнасць, афіцыйнасць, натуральнасць маўлення, сцісласць, абстрактрасць, непасрэднасць, вобразнасць, эмацыянальнасць, строгая аб’ектыўнасць, канкрэтнасць, экспрэсіўнасць, адсутнасць строгай лагічнасці, аргументаванасць, даходлівасць, індывідуальнасць аўтара, агульназразумеласць, стандартызацыя, адсутнасць эмацыянальнасці.

## 11 Навуковы стыль

*Заданне 11.1*

Пералічыце ў тэксце з задання 8.10 прыкметы навуковага стылю, праілюструйце іх прыкладамі. Вусна перакажыце тэкст на беларускай мове такім чынам, каб яго стыль вызначаўся як гутарковы альбо мастацкі.

*Заданне 11.2*

Складзіце паслядоўна інфарматыўную, індыкатыўную анатацыі на любы артыкул з навуковага часопіса (па ўласным выбары), а таксама анатацыю-картку на любую навукова-папулярную кнігу для каталога з агульнай бібліятэкі ўніверсітэта. Запішыце іх і вызначце адрозненні.

*Схема анатацыі.*

1 Прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара.

2 Назва твора.

3 Месца выдання, выдавецтва, год.

4 Аб’ём (колькасць старонак, малюнкаў, табліц).

5 Кароткі змест (пералік асноўных палажэнняў тэксту-крыніцы, можна па главах).

6 Пытанні, разгледжаныя ў заключэнні і высновах.

7 Выкарыстанне ў тэксце літаратуры.

8 Чытацкае прызначэнне.

*Даведка*: Моўныя стандарты (клішэ) для складання анатацыі.

Артыкул (работа) апублікаваны (змешчаны, надрукаваны …) у часопісе (газеце …). Манаграфія (кніга) выйшла ў свет у выдавецтве …

Артыкул прысвечаны пытанню (тэме, праблеме …)

Артыкул уяўляе сабой абагульненне (агляд, выклад, аналіз, апісанне …) (чаго?)

Аўтар ставіць (асвятляе) наступныя праблемы … закранае наступныя пытанні … засяроджвае ўвагу на праблемах…

У артыкуле (кнізе, раздзеле …) разглядаецца (абагульняецца …) (што?) гаворыцца (пра што?) даецца ацэнка (аналіз, абагульненне) (чаго?) прадстаўлены пункт гледжання (на што?)

Артыкул (…) адрасаваны (каму?) можа быць выкарыстаны (кім?) уяўляе цікавасць (для каго?

***Заданне 11.3***

Напішыце рэферат на любы артыкул з «Весніка Беларуска-Расійскага ўніверсітэта» альбо іншага навуковага часопіса.

*Структура і змест рэферата.*

1 Уступ (загаловачная частка). Ва ўступнай частцы даецца характарыстыка зыходных характарыстык артыкула: аўтар, крыніца, раскрыццё сэнсу артыкула, назва, чаму прысвячаецца, вызначэнне характару артыкула.

2 Апісанне (уласна-рэфератыўная частка). Яна ўключае ў сябе кароткі змест асноўных пералічаных пытанняў і праблем, закранутых у артыкуле, вынікі даследаванняў, аналіз двух-трох пытанняў, якія, на думку рэферэнта, з'яўляюцца асноўнымі, выклад пазіцыі аўтара, даведкавую частку, у якой указваецца колькасць ілюстрацый, табліц, бібліяграфію.

3 Заключная частка. Заключная частка змяшчае вывад аўтара, заўвагі рэферэнта аб значэнні артыкула, ацэнку паўнаты своечасовасці разгляду праблем

*Даведка*: Моўныя стандарты (клішэ) для складання тэксту рэферата.

Артыкул (кніга, манаграфія, зборнік …) складаецца з уводзінаў … (двух, …) главаў (раздзелаў …)

Артыкул называецца (носіць назву, мае назву)

У першым (другім …, дадзеным) раздзеле (кнігі, дакумента …)

Аналізуецца (даследуецца, асвятляецца …) (што ?), праблема (якая?), даецца аналіз (чаму?)

У даследаванні (навуковай працы, урыўку …) аўтар ставіць (асвятляе, падымае, закранае) пытанні (праблемы) …

Гаворка ідзе (пра што ?) пра тое, што …

У артыкуле (…) пададзены пункт гледжання на …

Падрабязна даследуюцца формы і метады (чаго?)

Звяртаецца ўвага (на што?), даказваецца (што?)

Падкрэсліваецца выключна важнае значэнне …

Асобна разглядаюцца пытанні (чаго?) (якія?)

Далей адзначаецца (што?)

У заключэнні аўтар гаворыць (што?) (пра што?)

У выніку робяцца высновы: «…»

Завяршаючы работу, аўтар піша: «…»

Аўтар прыходзіць да вываду (заключэння …), пераканаўча даказвае …, прытрымліваецца пункту гледжання …, крытыкуе …

***Заданне 11.4***

У артыкуле, выкарыстаным для напісання рэферата, вылучыце:

– кампазіцыйна-структурную арганізацыю навуковага тэксту (тэма, падтэма; апісанне, апавяданне, разважанне);

– сродкі лагічнай сувязі на узроўні сказаў, абзацаў, адрэзкаў тэксту;
– спасылкі на крыніцу інфармацыі.

***Заданне 11.5***

Падбярыце пяць тэкставых і электронных крыніц, якія можна было б выкарыстаць пры падрыхтоўцы навуковай работы па вашай спецыяльнасці. Аформіце іх у адпаведнасці з патрабаваннямі (Высшая аттестационная комиссия Республики Беларусь (vak.gov.by)).

## 12 Афіцыйна-справавы стыль

***Заданне 12.1***

Напішыце аўтабіяграфію па наступнай схеме.

1 Назва дакумента.
2 Прозвішча, імя, імя па бацьку, дата і месца нараджэння аўтара.
3 Прозвішчы, імёны, імёны па бацьку, дата і месца нараджэння, месца работы з указаннем пасады бацькі, маці, родных братоў і сясцёр аўтара.
4 Кароткі аповед пра гады вучобы, пачынаючы з года паступлення ў першы клас. Калі змяняліся месцы вучобы, то неабходна ўказаць, у якім годзе. Далей пазначаецца год заканчэння школы, вучоба ў ПТВ, ССНУ, ВНУ. Пры гэтым указваецца год заканчэння, назва атрыманай спецыяльнасці.
5 Указаць (калі была) службу ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь.
6 Указваецца пры наяўнасці месца работы з указаннем пасады.
7 Адзначаецца грамадская дзейнасць.
8 Указваецца сямейнае становішча, прозвішча, імя, імя па бацьку, дата і месца нараджэння, месца работы з указаннем пасады мужа/жонкі. Калі ёсць, прозвішчы, імёны, імёны па бацьку, дата і месца нараджэння дзяцей.
9 Дата афармлення дакумента (з левага боку, уключае восем арабскіх лічбаў), подпіс (з правага боку).

***Заданне 12.2***

Напішыце рэзюмэ (кароткае апісанне службовай кар’еры) па наступнай схеме.

1 Прозвішча, імя, імя па бацьку (інцыялы выкарыстоўваць не дазваляецца), хатні адрас, які ўключае індэкс, паштовы і электронны адрас і тэлефон (наяўнасць кожнага элемента абавязковая). Гэта інфармацыя змяшчаецца ў рэзюмэ з левага верхняга боку.
2 Дата і месца нараджэння.
3 Сямейнае становішча (замужам, жанаты, не замужам, халасты); калі ёсць дзеці, указаць іх узрост.
4 Адукацыя ў храналагічнай паслядоўнасці. Пачынаць мэтазгодна з даты заканчэння школы. Указваюцца гады вучобы, атрыманая спецыяльнасць. Калі вучоба працягваецца на дадзены момант, то падаецца год паступлення і

мяркуемая дата заканчэння навучальнай установы, указваецца будучая спецыяльнасць.

5 Указваюцца вучоба на курсах і стажыроўкі.

6 Дадатковы звесткі: удзел у семінарах, канферэнцыях з указаннем даты і назвы даклада, публікацыі ў друку (даецца поўнае бібліяграфічнае апісанне), узровень валодання кампьютарам, валоданне замежнымі мовамі, наяўнасць вадзіцельскага пасведчання з указаннем катэгорыі і стажа.

7 Асабістыя якасці, напрыклад, камунікабельнасць, пунктуальнасць.

8 Захапленні, інтарэсы.

***Заданне 12.4***

Складзіце па адным прыкладзе распарадчага, арганізацыйнага, арганізацыйна-распарадчага і інфармацыйна-даведачнага дакумента. Назавіце асноўныя адрозненні паміж дадзенымі дакументамі

***Заданне 12.3***

Знайдзіце ў сказах памылкі, выправіце іх; замяніце выразы-штампы словамі, якія дакладна перадаюць думку.

1 Студэнты ў большасці выпадкаў самі дабіваюцца выпраўлення недахопаў.

2 Трэба адзначыць, што ў многіх пытаннях яшчэ шмат гучных слоў і мала арганізатарскай работы.

3 Трэба прадставіць гэтай сям'і лепшыя жыллёвыя ўмовы.

4 На занятках прымяняю розную нагляднасць: табліцы, схемы, кадаскоп. Без іх немагчыма даходліва растлумачыць многія моўныя з'явы, правілы.

5 На кожным квадратным метры грунту агароднікі збіраюць у цяпліцы да васьмі кілаграмаў вітамінізіраваных прадуктаў.

6 Да дзвюх тысяч падыходзіць лічба абанентаў нашай бібліятэкі.

## 13 Культура прафесійнага маўлення

***Заданне 13.1***

Прачытайце выразы беларускага этыкету; устанавіце, калі яны ўжываюцца.

Добры дзень! Добры вечар! Добрай раніцы! Добрага здароўя! Маё шанаванне!

Як маешся? (Як маецеся?) Як справы?

Да пабачэння! Бывайце здаровы! Усяго добрага! Усяго найлепшага! Да сустрэчы!

Прабачце, калі ласка! Выбачайце, калі ласка! Даруйце, калі ласка! Дзякуй! Вялікі дзякуй! Шчыра дзякую вам за ласку!

Смачна есці!

*Заданне 13.2*

Падрыхтуйце выступленне, у якім вы пераконваеце студэнтаў іншых факультэтаў перайсці на факультэт, дзе вы вучыцеся.

*Заданне 13.3*

Падрыхтуйце выступленне, у якім вы пераконваеце аднагрупнікаў пачаць займацца спортам.

*Заданне 13.4*

Запрасіце ўсіх прысутных наведаць які-небудзь спектакль у адным з магілёўскіх тэатраў.

*Заданне 13.5*

Падрыхтуйце выступленне на бацькоўскім сходзе на тэму «Чаму важна весці здаровы лад жыцця».

*Заданне 13.6*

Складзіце тэкст прамовы па-беларуску для выступлення:

а) на ўручэнні дыпломаў аб заканчэнні ўніверсітэта;

б) на ўручэнні ўзнагароды «Студэнт года».

## 14 Тэмы для рэфератаў з прэзентацыямі

1 Гісторыя старабеларускай графікі: кірыліца, лацінка, арабская вязь.
2 Рымская і арабская сістэмы лічбаў. Як мы лічым. З гісторыі лікаў.
3 Фразеалагічная скарбонка беларускай мовы.
4 Сацыяльныя сеткі і гісторыя іх заснавання.
5 Роля айчынных вытворцаў у падтрымцы беларускай мовы: стварэнне брэнда, рэклама, праекты.
6 Тапанімічныя назвы Беларусі.
7 Замкі на зямлі Беларусі.
8 Каляндарна-абрадавыя святы Беларусі.
9 Сямейна-абрадавыя святы Беларусі.
10 Нашы юбіляры: жыццё і творчасць Янкі Купалы.
11 Нашы юбіляры: жыццё і творчасць Якуба Коласа.
12 Кніга «Беларуская граматыка для школ» Браніслава Тарашкевіча.
13 Магілёўскі свяціцель Георгій Каніскі.
14 Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць.
15 Архітэктурная спадчына Магілёва.

## 15 Заданні прадуктыўна-творчага ўзроўню

***Заданне 15.1.***

Распрацуйце віртуальныя экскурсіі па прапанаваных тэмах.

1 Мая малая радзіма: помнікі прыроды і культуры.
2 Гістарычныя помнікі Магілёва.
3 Этнаграфічныя музеі, комплексы і сядзібы Беларусі.
4 Прыродныя помнікі Беларусі.
5 Замкавая Беларусь.
6 Праваслаўныя храмы Беларусі.
7 Каталіцкія храмы Беларусі.
8 Літаратурнымі сцежкамі Беларусі.
9 Музычнымі шляхамі Беларусі.
10 Прадпрыемствы Магілёўшчыны.

***Заданне 15.2.***

Уявіўшы сябе кіраўніком фірмы па вытворчасці пэўнай прадукцыі (звязанай з вашай універсітэцкай спецыяльнасцю), падрыхтуйце беларускамоўную рэкламную кампанію сваіх тавараў і паслуг. Рэклама павінна мець канцэпцыю, слоган, візуальны і сувернірны складнікі, мэтавую аўдыторыю і інш.

## 16 Тэксты для перакладу і заданні, арыентаваныя на фарміраванне прафесійных кампетэнцый

Аб’яднаўшыся ў міні-групы, зрабіце пераклад на беларускую мову профільнага тэксту. Падкрэсліце тэрміны. Ахарактарызуйце спецыфічныя рысы пяці з іх, вынікі назіранняў занясіце ў прапанаваную табліцу 7.

Табліца 7 – Спецыфічныя рысы тэрмінаў беларускай мовы

| Тэрмін | Структура | Паходжанне | Утварэнне |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |

1 Слово «технология» имеет греческие корни и в переводе означает науку, совокупность методов и приемов обработки или переработки сырья, материалов, изделий и преобразования их в предметы потребления. Современное понимание этого слова включает применение научных и инженерных знаний для решения практических задач. В таком случае информационными можно считать также те технологии, которые направлены на обработку и преобразование информации.

Информационная технология – это совокупность методов, производственных процессов и программно-технических средств, объединенных в технологическую цепочку, обеспечивающую сбор, обработку, хранение, передачу и отображение информации.

Эффективность информационной технологии определяется в конечном счете квалификацией субъектов процессов информатизации. При этом технологии должны быть максимально доступны потребителям.

Информационные технологии можно различать по типу обрабатываемой информации. Разделение достаточно условное, т. к. большинство

информационных технологий позволяет поддерживать и другие виды информации. Например, в текстовых процессорах возможна и несложная расчетная деятельность, а табличные процессоры обрабатывают не только цифровую информацию, но и могут генерировать графики. Однако каждая из видов технологии в основном ориентирована на работу с информацией определенного вида. Модификация элементов, составляющих информационные технологии, дает возможность образования новых технологий в различных компьютерных средах.

2 Электродвигатели постоянного тока применяют в тех электроприводах, где требуется большой диапазон регулирования скорости, высокая точность поддержания скорости вращения привода. Работа электрического двигателя постоянного тока основана на явлении электромагнитной индукции. Из основ электротехники известно, что на проводник с током, помещенный в магнитное поле, действует сила, определяемая по правилу левой руки. При пересечении проводником магнитных силовых линий машины в нем наводится электродвижущая сила, которая по отношению к току в проводнике направлена против него, поэтому она называется обратной или противодействующей. Конструктивно все электрические двигатели постоянного тока состоят из индуктора и якоря, разделенных воздушным зазором.

Индуктор электродвигателя постоянного тока служит для создания статического магнитного поля машины и состоит из станины, главных и добавочных полюсов. Станина служит для крепления основных и добавочных полюсов и является элементом магнитной цепи машины. На главных полюсах расположены обмотки возбуждения, предназначенные для создания магнитного поля машины, на добавочных полюсах − специальная обмотка, служащая для улучшения условий коммутации.

Якорь электродвигателя постоянного тока состоит из магнитной системы, собранной из отдельных листов, рабочей обмотки, размещенной в пазах, и коллектора, служащего для подвода к рабочей обмотке постоянного тока.

3 Машиностроение остается важнейшей отраслью Беларуси с активным развитием сельскохозяйственного и транспортного направлений. В республике выпускается более 59 тысяч тракторов, 2 тысячи зерноуборочных комбайнов, 22 тысячи грузовых автомобилей, 2 тысячи автобусов в год.

Более 60 % продукции белорусского машиностроения реализуется за рубежом. Эксперты прогнозируют в среднесрочной перспективе рост спроса на белорусскую продукцию машиностроения в России и Казахстане, на долю которых совокупно приходится около 73 % белорусского машиностроительного экспорта. Белорусские предприятия в машиностроении широко известны за рубежом благодаря таким национальным брендам, как карьерные самосвалы «БелАЗ», тракторы «Беларус», грузовые автомобили «МАЗ». Спецтехника «Амкодор» и сельскохозяйственная техника «Гомсельмаш» также нашли свои рынки сбыта, постоянно расширяя географию экспорта.

Белорусское машиностроение занимает одно из первых мест в числе отраслей экономики, приоритетных для иностранных инвестиций. Предприятия республики заинтересованы в новых совместных проектах с целью сохранения экспортных позиций, получения нового опыта, внедрения инноваций и расширения линейки продукции. Среди реализуемых в настоящее время проектов − совместное предприятие представителей Китая и Минского автомобильного завода по выпуску двигателей для грузовиков, спецмашин и автобусов. Общий объем инвестиций в проект составляет 20 млн долларов.

4 Двигатель или мотор (с латыни *motor* – приводящий в движение) – это устройство, которое преобразует какую-либо энергию в механическую. В автомобилестроении наиболее распространенными двигателями являются ДВС (двигатели внутреннего сгорания) различных типов. Годом рождения первого ДВС считается 1801 г., когда француз Филипп Лебон запатентовал первый двигатель, работающий на светильном газе.

Наиболее массовым в современном автомобилестроении является ДВС. Не являющийся самым совершенным, он благодаря своей 100 % автономности применяется в большинстве современных автомобилей.

Среди двигателей автомобиля выделяют следующие типы:

а) бензиновые двигатели. Делятся на инжекторные и карбюраторные. Существуют разные типы карбюраторов и системы впрыска. Вид топлива – бензин;

б) дизельные двигатели. Дизельное топливо попадает в цилиндры через форсунки. Преимуществом дизельных двигателей является то, что им не нужно электричество для работы, оно необходимо только для запуска двигателя;

в) газовые двигатели. Топливом могут служить как сжиженные и сжатые природные газы, так и генераторные газы, полученные путем преобразования твердого топлива (уголь, дерево, торф) в газообразное.

5 Независимо от выбранной конструкции лестницы при ее строительстве необходимо придерживаться определенных нормативов. К примеру, между двумя маршами либо между потолком и маршем должно быть расстояние не менее 2 м по вертикали, что необходимо для свободного перемещения по лестнице взрослому человеку. Ширина марша должна допускать возможность передвижения по ступеням сразу двух человек. Но в любом случае не допускается строительство лестницы, если ширина марша будет меньше 600 мм.

Любая лестница должна сопровождаться надежным ограждением, которое можно сделать в виде поручней, которые смогут выдержать соответствующие нагрузки. Высота поручней не должна быть менее 900 мм. Конструкции лестниц состоят из основания и ступеней. Площадки между маршами и перила относятся к дополнительным элементам. В конструкцию лестницы могут входить:

а) косоур, представляющий собой наклонную несущую балку. Именно на нее опираются ступени марша;

б) тетива, во внутреннюю сторону которой «врезаются» ступени;

в) больц, под которым подразумевается стальной элемент, способствующий соединению ступеней между собой;

г) опорная труба, вокруг которой закручивается винтовая лестница;

д) проступь или по-другому горизонтальная часть ступени;

е) подступенок – вертикальная часть ступени, которая закрывает зазор между соседними проступями, придавая дополнительную жесткость;

ж) балюстрада – ограждение лестничной площадки круглой формы;

з) балясины – декоративные элементы ограждения.

## 17 Пытанні да заліку

1 Мова і соцыум, функцыі мовы ў грамадстве.

2 Гістарычныя этапы развіцця беларускай мовы.

3 Месца беларускай мовы сярод моў свету.

4 Сістэма нормаў беларускай літаратурнай мовы.

5 Білінгвізм, яго разнавіднасці. Паняцце інтэрферэнцыі. Трасянка.

6 Адметнасць фанетычнай сістэмы беларускай мовы.

7 Арфаэпія. Асноўныя правілы беларускай арфаэпіі.

8 Правапіс галосных у сучаснай беларускай мове.

9 Правапіс зычных. Правапіс мяккага знака і апострафа.

10 Правапіс вялікай і малой літар. Правілы напісання разам, праз злучок і асобна.

11 Слова як аб’ект вывучэння лексікалогіі. Лексічнае значэнне. Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнне слова.

12 Сістэмныя адносіны ў лексіцы (амонімы, сінонімы, антонімы, паронімы).

13 Дыферэнцыяцыя лексікі беларускай мовы паводле паходжання. Асноўныя прыкметы іншамоўных слоў.

14 Дыферэнцыяцыя лексікі беларускай мовы паводле сферы выкарыстання.

15 Тэрміналогія. З гісторыі фарміравання беларускай спартыўнай тэрміналогіі.

16 Асноўныя спосабы ўтварэння тэрмінаў. Характарыстыка тэрмінаў паводле паходжання.

17 Фразеалагічнае багацце беларускай літаратурнай мовы.

18 Скланенне назоўнікаў у сучаснай беларускай мове.

19 Разрады прыметнікаў у беларускай мове. Ступені параўнання прыметнікаў.

20 Лічэбнік. Асаблівасці ўжывання і скланення.

21 Дзеяслоў. Асаблівасці ўжывання і змянення.

22 Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе. Утварэнне і ўжыванне. Асаблівасці перакладу на беларускую мову.

23 Функцыянальныя стылі маўлення: агульная характарыстыка.

24 Публіцыстычны стыль, яго асаблівасці. Беларускія фінансава-эканамічныя СМІ.

25 Навуковы стыль, яго асаблівасці. Жанры навуковай літаратуры.

26 Кампазіцыя пісьмовага навуковага тэксту. Цытаты і спасылкі, іх афармленне.

27 Афіцыйна-справавы стыль, яго рысы.

28 Віды афіцыйна-справавых тэкстаў. Патрабаванні да іх напісання і афармлення.

29 Падрыхтоўка да публічнага выступлення. Маўленчы этыкет і культура зносін.

30 Лексікаграфія. Тэрміналагічныя слоўнікі (па спецыяльнасці).

## Спіс літаратуры

1 Арфаэпічны слоўнік беларускай мовы / Нац.акад. навук Беларусі: [і інш.]; уклад.: В. П. Русак [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2017. − 757 с.

2 **Баршчэўская, А. Л.** Арфаграфічны слоўнік беларускай мовы / А. Л. Баршчэўская, Л. П. Баршчэўскі. – Мінск : ІП Уладзімір Сіўчыкаў, 2018. – 560 с.

3 Беларуская мова. Прафесійная лексіка. Сацыяльна-гуманітарныя навукі : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / М. Р. Прыгодзіч [і інш.] ; пад рэд. М. Р. Прыгодзіча, У. І. Куліковіча. – Мінск : РІВШ, 2015. – 258 с.

4 Беларуская мова. Прафесійная лексіка. Экалагічны профіль : вучэбны дапаможнік / М. М. Круталевіч [і інш.] ; пад рэд. М. М. Круталевіча. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2020. – 283 с.

5 **Буракова, М. У.** Беларуская мова. Тэхнічная тэрміналогія : вучэбны дапаможнік / М. У. Буракова. – Мінск : РІВШ, 2016. – 264 с.

6 **Дзятко, Д. В.** Беларуская мова: тэрміналогія фізікі і матэматыкі [Электронны рэсурс] : вучэбна-метадычны дапаможнік / Д. В. Дзятко, М. К. Чаеўская, А. М. Муравіцкая. – Мінск : БДУ, 2016. – 285 с.

7 **Зразікава, В. А.** Беларуская мова. Прафесійная лексіка для эканамістаў : вучэбны дапаможнік / В. А. Зразікава, А. В. Губкіна. – Мінск : Вышэйшая школа, 2016. – 383 с.

8 **Маршэўская, В. В.** Беларуская мова. Прафесійная лексіка для матэматыкаў і фізікаў (з электронным дадаткам) : вучэбны дапаможнік / В. В. Маршэўская. – Мінск : РІВШ, 2019. – 228 с.

9 Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / І. Л. Капылоў [і інш.] ; пад рэд. І. Л. Капылова. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2016. – 968 с.